Уладзімір МАЗГО

Марафон



Уладзімір МАЗГО

Марафон

ВЕРШЫ І ПАЭМА

Мінск
„Мастацкая літаратура"
1992


ББК 84 Бел 7
М 13

В третьей по счету книге стихов автор показывает сложный мир нашей действительности. Седое прошлое родного края также глубоко волнует его, как и противоречивая современность.

Поэт понимает, что без исторической памяти никакой народ не будет иметь будущего. Наша жизнь, утверждает он, это непрерывный марафон, через который надо с достоинством пронести мечту и веру, надежду и любовь.

М $\frac{4702120202-078}{М 302 (03) - 92}$ 52–92

ISBN 5–340–00907–6 © В. М. Маго



Прачнуцца –
І здзівіцца дню,
І сонейку здзівіцца,
Нібы вось так
Упершыню
Нанова нарадзіцца,

Душой уласнаю адчуць
Сваю зямлю,
Край мілы
І не лапаткі развінуць,
А складзеныя
Крылы...



Тут ява
З казкаю мяжуе,
А згадка –
Сэрца апячэ.
На Нёман велічны
Гляджу я,
А ён цячэ,
Цячэ,
Цячэ...

Маўкліва
З вечнасцю гаворыць
Між гонкіх сосен
Трапяткіх.
Услед за ім
Бягуць да мора,
Глыбінь шукаючы,
Радкі.

А дзень блакітны,
Дзень пагожы
Бярэ,
Чаруючы,
Ў палон...
Дзе гэта:
Ў сэрцы
Ці ў Каложы
Прачнуўся звон?..

БАРЫСАЎ КАМЕНЬ

З сівое даўніны
Адбіты
Ў дрогкай сіні
Заходняе Дзвіны
Легенды Ефрасінні.

На строме,
У кастры,
Варушыцца вуголле.
Бяздомныя вятры
Сабакамі скуголяць.

А памяці агонь
Гарыць,
Пячэ балюча,
Каб не забыў каго
Я тут,
На гэтай кручы...

На дахі
Льецца звон
Праз сцішанасць
Начную.
Вякоў мінулых скон
Збалелым сэрцам
Чую.

Тварыў вось тут
Народ
Гісторыю – вякамі...
Ці час
Не ў наш гарод
Шпурнуў
Барысаў камень?..

АМАЗОНКА

(Паэма)

1. Навала

Ці не зноўку –
У дазоры –
Трубы
Трубяць звонка?..
На скаку
Каня прышпорыць
Спрытна
Амазонка.
Пранясецца,
Нібы вецер,
Грозна
Над травою, –
Рэхам
Спуджанае вецце
Адгукнецца вою
Каля Нёмана сівога,
Вобак
Юнай Шчары...
Шабляй –
Вострая дарога
Рассячэ абшары,
За якімі люты вораг
Здзекліва чакае.
Паспытае
Рускі порах
І клінкі Тракая!..[1]

[1] Літоўскі уланскі полк у ар'ергардзе 2-й рускай арміі ў ліку першых прыняў бой з войскамі Напалеона на тэрыторыі Беларусі.

Бо чаканне –
Перад бурай.
Толькі вецер енчыць.
Толькі неба
Хмарай хмурай
Аб пагрозе сведчыць.
А гасцей –
Паўсюль прывецім:
У Гароднi,
Росі...
Калі з мірам вы,
Суседзі, –
Чым багаты –
Просім!..
– Калі ласка!.. –
Скажам шчыра,
Стрэнем
Хлебам-соллю.
А нязваным кірасірам
Галаву –
Паголім
Востраи шабляй.
Доўгай дзідай
Чужаніц –
Наколем.
Каб ім
Нашых краявідаў –
Не забыць ніколі.
Каб запомнілі:
Граніцы
Тут –
Радзімы-маці!..
Не дамо
Чарніць крыніцы
І жыты –
Таптаці.

Многа набрыдзі
Было тут:
Печанегі,
Гуны...
Помняць пінскія балоты
Польскія драгуны,
Банапарта кірасіры,
Бітыя –
Ушчэнткі...
У Нясвіжы,
Крэве,
Міры –
За́мкі –
Часу сведкі.

2. Сталенне

Сядло было маёй першай калыскай, конь, зброя і палкавая музыка – першымі дзіцячымі цацкамі і забавамі...

Н. Дурава

А помніш:
Твар сіроткі,
Зажураны ад болю.
Паўсюль
Гусарскі ротмістр
Вазіў дачку з сабою.
Цябе расцілі –
Беды,
І няньчылі –
Паходы.
Жадала змалку ведаць:
У гэтым свеце –
Хто ты?...
Твой бацька ў наступленнях

Змагаўся па-геройску.
Таму
Парой сталення
Ты марыла
Аб войску.
Прывыклая да волі,
Як стэпавая ціша,
Ты не жадала долі
Сабе ніколі –
Іншай.

3. Выпрабаванне

23-гадовая амазонка Надзея Дурава пад мужчынскім імем запісалася ў Гродзенскі уланскі полк...

Эпалеты –
З нечай ласкі –
Мець не ўсім магчыма.
А таму
У полк уланскі
Ты прыйшла –
„Мужчынам”,
Што дакажа ў час суровы
Злыдням –
Чаго варты.
Секчы набрыдзі галовы –
На скаку –
Не жарты!..
Дзе парою ўлан не кожны
Вынесе напалу, –
У Парыжы
Шаблю ў ножны
Пераможна ўклала...

4. Купанне

„Рака
Дасвецція шэрага,
Схавай
Ад вока злога!..
Хто я –
На фоне берага?.. –
Сапраўдная аблога!..”
...І –
З думкаю такою –
Яна ўвайшла
У хвалі,
Якія трапяткою
Надзеяй
Адступалі...
Жаданню дагадзіла –
У марах –
Як хацела.
І золатам свяціла
Аголенае цела...
Зірнула:
Гэта ж –
Промні
Ўгары
Цікуюць нема...
Гайдалася
У Нёмне
Абрынутае неба...

5. Конь Алкід

Мой верны конь Алкід,
Сябрук на полі сечы, –
Не пудзіўся які

Ні шабель,
Ні карцечы,
Чаго так заіржаў –
Мо ворагаў пачуў ты?..
Ці мо спачыць, на жаль,
Не можаш –
Ні мінуты?..
А згадка,
Як кап'ё,
Спяшаецца параніць.
Зарой
Аблок куп'ё –
На ўсходзе –
Узарана...

6. Помста

Ад Міра
І да Турава
Дымілася зямля...
Яна –
Надзея Дурава –
Меч помсты
Узняла...

7. Летапісец

Вятрыска
Штоночы
Шаптаўся
Нясмела...
Як ты –
Па-жаночы
Яго разумела.

Кляла талкавіску
Варожая сіла...
Як ты –
Па-мужчынску –
Свой край бараніла!..
Хмурына бялела
У сонечнай высі.
Пра што набалела –
Пісаў летапісец...
Дадому –
Далёка,
Ды носу –
Не вешай!..
Заўсёды нялёгка,
Вядома, –
Быць першай...
Надзеі –
Што птушкі
З вышыняў няблізкіх:
Бялінскі і Пушкін
Чытаюць „Запіскі"...[1]

[1] А. С. Пушкін і В. Р. Бялінскі высока ацанілі літаратурны дар „беларускай амазонкі", якая апублікавала свае ваенныя запіскі і ўспаміны аб кампаніі 1812–1814 гг.



Гэта свята заўсёды
І майго пакалення:
Нібы вечнасці подых –
Вызваленне...

Дзе раллю адраджалі
Пасля снежнага мліва, –
Узняліся на нівах
Узахлёб
Ураджаі.

У нашчадкаў –
І сіла,
І сумленне,
І розум...
Маці –
Белай бярозай
Каля брацкай магілы,

Як ні хіліцца нізка, –
Успаміны параняць.
На ілбе
Кожнай рыскай
Адгукаецца памяць.

ЛЯСНАЯ БАЛАДА

1

Ты бяжыш уранні
І барам крычыш:
— Гэй,
Зязюля-пані,
Шчасце падлічы!..

Салаўіны пошчак,
Чэзне
Ў далях ціш.
Аж да самай
Польшчы,
Песня,
Даляціш...



Рэха,
Нібы казуля,
Пераскочыла крык:
— Можа,
Гэта зязюля
Праглынула язык...

Ад яе
Нам не ўкрасці
Ні трывог,
Ні тугі.
Пашукаем жа
Шчасця
У зязюляў другіх...

Хай сядзіць
Адзінока
На трухлявай сасне.
Падміргнула
Мне вокам
І растала,
Як снег...

Ды грудок
Ля сасонкі
Нечакана замёр...
Таямніцы старонку
Перагортвае бор.

2


Жыў на свеце
Ляснік малады
Сярод пушчы,
А побач —
Зязюля...
І не знялі
Ніколі бяды.
І не чулі...

Ведаў ён,
Дзе якая трава,
Ці надрэз
У якое сасонкі.
А над ім
Птушкі кліч шчыраваў —
Звонкі-звонкі...

Ад бароў
Да сяброў не спяшаў
Хіба ён выпадкова?

Не зязюля была –
А душа
Леснікова...

І сустрэне штораз
На зары,
І праводзіць –
Штоночы...
Толькі лёс
Наказаў кіпцюры
Ім аднойчы...



Ён маўчаў...
Ён зацята маўчаў,
Да сасны прывязаны.
Гыркаў вораг:
– Ну, рус, отвечаль:
Партизан ты?..

Ён маўчаў...
Ён упарта маўчаў.
Толькі хрыпла
Зязюля крычала.
Адчуваў
Халадок ля пляча
Аўтаматнага джала.


Ён не выдаў
Нікога з сяброў,
Хоць так мала
Пражыта...
І застаўся навек
Між бароў,
Перунамі прашыты.

Грымнуў стрэл...
Затуманіўся дым.
Неба ўміг –
Пацямнела...
Не забілі
Зязюлю тады –
Назаўжды
З той пары
Анямела.

3

Я стаяў
У світальным бары
І пачуў,
Што другія не ўчулі...
Вы ніколі
Не чулі, сябры,
Той –
Нямое зязюлі?..

3 Зак. 49



Такая ціш –
Да нематы.
Асвеціць сцены
Ранне:
Фарты –
Крывавыя бінты
Ў маёй зямлі
На ране.

І мне
Таксама забаліць
Ад позірку
Чужога.
Крадзецца
Сэрца апаліць
Трывога.


За, развітальную,
Цябе.
За лёс
Усёй планеты.
Не раз
У ранішняй журбе
Я думаю аб гэтым.

Пільней
Вартую цішыню
Пад месяцам
Двухрогім.
І веру
Памятнаму дню
Здабытай Перамогі.



З часоў мінулай вайны ў Калінінградзе застаўся разведзены мост...

Да Балтыкі
Ў адведзіны
Спяшаемся гурбой.
І раптам –
Мост разведзены
Між мною і табой...
Застыў пагрознай навіссю
Тых,
Выклятых, гадоў,
Як напамін:
З нянавісцю
Разведзена любоў...
– Вось так –
Усе гады –
Разведзены масты:
Між мірам
І вайной,
Між праўдай
І маной...
Гісторыя аголена
Да існасці.
З вады
Век цягне
Над Прэголяю
Туманаў невады.
Густы блакіт над намі
Ці
Хмурыначкі тугі, –
А над ракой –
Мост памяці
Яднае берагі.



Мой сакавік
Павёў адлік
Гадам пражытым,
Калі нябёсы
Пачалі
Гусцець блакітам.
Штодня
Званчэлі галасы
Вясны-спявачкі
І прачыналіся
Лясы
Ад зімняй спячкі.
Скакала рэха
Між галін –
Ажно да Горны.
І абуджаліся
Палі
Пад небам зорным.
Адчуў
Бунтоўную вясну
Крылатай мары
І у нябёсы
Баразну
Праклаў Гагарын,
Каб жыта сеялі
Як след,
А потым –
Жалі.
Каб ні сусед нам,
Ні сусвет –
Не пагражалі...



Зэльва.
Савецкая, 5...
Шчымліва,
Ўспамінна
І песенна.
Між зорак,
Якія не спяць,
Пагасла
Акно паэтэсіна.
Але
Не забудзецца двор,
Маленства пазначаны
Рысаю.
Як зборнік,
Раскрыты прастор,
Падпісаны
Цёткай Ларысаю.
Гасцінны,
Прыветлівы дом,
Размоваю цёплы
І кавою.
І песня,
Якую нагбом
Мы п'ём
Чабарова-гаркавую.
Гады
Незваротна ляцяць.
З іх кожны –
Радзіме прысвечаны...
Не краскі
Ад ганка глядзяць, –
А ўдумныя
Вочы суседчыны.

ДЗЕНЬ ВОЛІ

Бунтоўная вясна.
Травы
Зялёны выбух.
Галінкаю сасна
Пастукалася ў шыбу.

Прасвечана наскрозь
Рачулачка
Да донца,
Калі на рогі лось
Узняў
Лясное сонца.

Праменіцца абсяг
Птушынага блакіту,
Дзе птах,
Нібыта сцяг
Адроджаны з нябыту.

Вясновай волі дзень, –
Я ведаю, –
Настане,
Калі трава вядзе
Зялёнае паўстанне.

ВЯРТАННЕ КРЫЛАТЫХ СЯБРОЎ

Ад Заходняй Дзвіны
І да Нёмана,
Ад дняпроўскіх
Да бугскіх віроў,
Веснавым захлынуўшыся
Гоманам,
Мы вітаем
Крылатых сяброў,

Што сягоння
Вяртаюцца з выраю,
Абудзіўшы
Зімовыя сны,
Незвычайна далёкай,
І шчыраю,
І жаданай
Дарогай вясны.

Зашчабечуць
Шпакоўні над хатамі,
Заклякочуць
Буслянкі ўгары,
І адчуем таксама
Крылатымі
Мы сябе,
Нібы нашы сябры.

ЮРКУ ГОЛУБУ

...паэзія — гэта прыватная практыка пад зорамі.

З аўтографа на кнізе „Векапомнае поле"

Пакуль зара
Ля Горны
Не раскладзе
Касцёр,
У моры
Рукатворным
Гуляюць
Блікі зор.

Ускінеш голаў:
Высі
Падобны ярыне —
Так густа
Зорны высеў
Сягоння зарунеў,


Што зэльвенскім
Палеткам
Не ўступіць
На ўраджай,
Дзе адкрыццю —
Мы сведкі
Адзіныя,
Бадай...



Пратрубіў пабудку
Ў лесе
Лось старанна.
Ранак самакрутку
Раскурыў з туману,

Зыркаю заранкай
Бліснуўшы —
Сярнічкай.
Сіняя Зальвянка
Ценькае сінічкай.

Сну ўсё меней,
Меней,
Як аблок у Нёмне.
Сабіраю жменяй
Залатыя промні...




Шуміць за вокнамі
Вада,
Гудуць вятры ліхія.
Але стыхія –
Не бяда,
Ты сам –
Дзіця стыхіі,
Калі
Адкрытаю душой
Нанова
Убярэш ты
І шэпт садоў,
І шум дажджоў,
Пранізаны дарэшты.
Расчыніш
Выстылы балкон
Цыклону,
Як цыклопу,
І гукі слухаеш спакон
Сусветнага патопу,
Навек замоўлены,
Лічы,
Ад хатняга спакою –
Святлом
Маланкавай начы
І цемраю
Скразною...

ПАЛАСА ПЕРАШКОД

Міхасю Скоблу

Калі цяжка,
Аж пот
Вочы засціць ратаю –
Паласу перашкод
Зноў тады прыгадаю.
Там бязвусы узвод –
У сталення зеніце –
Кожны дзень,
Кожны год
Спасцігаў таямніцы.
Лабірынт,
Нібы бінт,
Хваляванне загоіць,
Каб ніколі ў нябыт
Не сышло дарагое.
Роў шырокі –
Навек
Страхі ўтопіць,
Сумненні.
Як вада мірных рэк,
Чыстым будзе –
Сумленне.
І пакліча ў палёт
Зноўку
Мара старая.
...Паласой перашкод
Мы жыццё выяраем.



Няміга,
Карыдор пусты
Метро начнога.
Цераз стагоднія пласты
Бруіць дарога.

Ныраe
Ў котлішча вякоў
З вышынь прагрэсу.
Зямля –
Па волі землякоў –
Зняла завесу...

Няміга,
Станцыя метро.
Гудок світальны.
Вось-вось
Падземнае нутро
Раскрые тайны.

А там –
Бяссонная рака
Забытым гулам
Напомніць хоча
Менчукам
Аб іх мінулым...



Заложнікі... Заложнікі бяды.
Баімся глебы, сонца і вады.
Галовы нам, а з намі – і Еўропе
Чарнобыля пакрыў смяротны попел.


Хаця вада той хойніцкай крыніцы
Халоднаю развагаю бруіцца,
Буяюць белай квеценню сады, –
Яны, як мы, заложнікі бяды...

ДЭЗАКТЫВАЦЫЯ

Змываем пыл,
які пускалі нам у вочы –
Да лозунгаў і рапартаў ахвочыя, –
З дарог палескіх
і уласных твараў,
З жытнёвых ніў
і сонечных абшараў.
Свідруе набалелае пытанне:
Ішлі наперад
і не бачылі таптання?
Таму што пыл пускалі нам у вочы,
Да лозунгаў і рапартаў ахвочыя.
Пісалі
ці заводзілі раманы,
А моладзь ачмуралі наркаманы.
Не зналі
ці баяліся пагудкі,
А кодэкс распіналі прастытуткі...
Змываем пыл,
які пускалі нам у вочы,
Да лозунгаў і рапартаў ахвочыя...



Адчуеш
Рабскія пакуты,
Да лунцуга чаргі
Прыкуты,
Калі шкарпэткі
Ці шпалеры
Бяруць асадаю
Галеры
Пакупнікоў-грабцоў
У скрусе
Ля ГУМа,
ЦУМа,
Беларусі...
Тады сябе
Рабом адчуеш,
Калі ў чарзе
І заначуеш,
І не спужаешся
Хваробы,
Каб паўтарыць уранні
Спробы...
Чаканне
Новага тавару...
Адзін другога
Знаюць з твару.
– Каторы ты?
– А ты каторы?.. –
Нервова высветляць
У зморы, –
Ад поту мокрыя,
Што ў лазні,
Пад нумарамі, –
Людзі-вязні...



Прыбудзе заўтра
Зноў магіл,
Прыбудзе.
Нас сёння судзяць
Не багі –
А людзі.

Штодня вакол
Ліецца кроў –
Гуляем.
Знаходзім ворагаў,
Сяброў –
Губляем.

Дакуль варожасць
На зямлі
Такая? –
Хто ў нас канкрэтна
І калі
Спытае.

Бо не адно
Ліецца кроў
Стагоддзе...

Між нашых ворагаў –
Сяброў
Знаходзім.



Гандлююць целам
І душой,
Нібы на кірмашы.
І не ў краіне
Нам чужой,
А побач –
На шашы.

Прагаласуюць,
Акурат
Падкрэсляць напаказ:
– Бяры
Каханне напракат,
Аўтамабільны ас.

Вязі –
Ну хоць на свету край
Альбо ў кювет
Рулі,
Адно –
З кішэні даставай
Памятыя рублі.

Ляці, шафёр,
Гані, шафёр,
Таксі
Пад ветру свіст.
Вачмі страляючы ва ўпор,
Здаецца інтурыст.

Не страшыць СНІД,
І Айбаліт
У іх
Падпольны ёсць.

5 Зак. 49


Што ім міліцыя,
Калі
Закон –
Бяспраўны госць...

Гандлююць целам
І душой,
Нібы на кірмашы.
І не ў краіне
Нам чужой,
А побач –
Ля шашы...




Плююць у студню на зары,
З якой пілі нядаўна,
Мае ўчарашнія сябры –
Адкрыта ўжо,
не тайна.

Сабе і іншым не мані,
Спасцігшы ўсё
дарэшты.
Але ж у студню зазірні:
Ці не ў сябе плюеш ты?..



Павісне свет
на вастрыі ляза,
І знічка упадзе,
нібы сляза.
Дзе выйсце?..
Прыйдзе потым
ці адразу?..
Пытанняў
значна болей,
чым адказаў...



Жыццё
Губляе сэнс,
Калі жывеш
Без мэты.
А час,
Як экстрасэнс,
Намацвае
Сакрэты.

Як мы раней
Жылі?..
Маліліся
На зоры.
І толькі
На Зямлі
Адчулі
Цэнтр апоры.

Як мы жывем
Цяпер –
На скрыжаванні
Веку?
Ці сябар ты,
Ці звер
Другому чалавеку?..



Здалося мне –
Мой век ляціць
Са снежнай горкі.

І не суняць,
І не спыніць
Вятроў гаворкі.

На аркуш белы
Лёг санет
Пад палазамі.

За летуценнем
След у след
Ляцелі сані.

Бывае гэтак
У жыцці:
Дзей адгалоссе...

– Мне падалося –
Век ляціць?..

– Не па-
да-
ло-
ся...



Два дні
Завея бунтавала.
Два дні
Няспынна бінтавала
Мае сумненні,
Смутак, боль.
Í вокны.
І нічога больш.
І доўга
Ціша галасіла
І нема
Літасці прасіла.


БУДАТРАДАЎЦЫ

Еўропы,
Як хваробы,
Палохаліся ўпотай.
З плячэй скідалі робы,
Прасоленыя потам.
Былі нязвыкла рады
Жаданай
З домам стрэчы.
Без песні будатрады,
Нібы без поўні –
Вечар.
Таму крылялі песні
Штодня
Ў паднебнай шыры.
Рамантыку –
Хоць трэсні! –
Пакінулі ў Сібіры,
У непраглядных нетрах
З аўтографам сякеры...
Пячаткай стыне ветах
На воблаку паперы.

СЛЯДЫ

Пасля сябе сляды
Пакінуць нам
Равеснікі,
Як саджанцы –
Плады,
А птушаняты –
Песенькі...
Як нівы –
Каласы,
Як зорачкі –
Маністы.
Вільготны след расы
І сонца –
Прамяністы.
І пакідаюць след,
Адметныя і розныя:
Адны
Ўзаруць Сусвет
Ракетнымі баразнамі.
Другія
Ўсеюць бор
Разбітымі бутэлькамі,
Заносячы тапор –
Пад новы год –
Над елкамі.
У вочы
Мне глядзіць
Зямля,
Як маці –
Сыну.
І сорамна –
Слядзіць,
І шчасна –
След пакінуць...

6 Зак. 49



Мой лёс,
Адчуць хоць раз дазволь
Чужы,
Нібыта ўласны,
Боль.
Адзінае
Ў цябе прашу:
Крані збалелую душу
Тугім
Вятрыскавым крылом,
Нібыта песню над сялом...
І заспявае спакваля
Не раз апетая
Зямля.

***

Хаця
          даўно адкрытае
                    спазнаў,
Адзначыш,
          не хаваючы здзіўлення,
Што кожная чарговая вясна
Табе прыносіць
          радасць абнаўлення...


ТВАЁ ІМЯ

Тамары

Жар сонца,
Холад хмараў,
Капеж
Ці лістабой —
Тваё імя,
Што мара,
Пакліча
За сабой.

Жаданы міг
Настане —
Забудзем
На спачын:
Тваё імя
Світаннем
Зоймецца
Уначы...

Над сонечным
Абшарам
Цень чорны
Прабяжыць, —
Тваё імя,
Што мара,
Дапамагае
Жыць...



Пакойчык сцішаны.
Світае.
Пагаслі зоркі
За акном.
А ты маўчыш,
Нібы святая,
Са мною,
Грэшным,
Заадно.

Яшчэ не раз
Наб'еш аскому,
Калі сягоння –
Саграшыш,
Але праспекту
Гарадскому
Не аддасіся
За грашы.

За шыбай
Раніца лясная
Заспаным зверам
Пракрычыць...
Маўчыць зязюля,
Бо не знае,
Як наша шчасце
Падлічыць...

СПРАДВЕЧНАЕ

Дзе гром грымеў –
Прастор ацiх.
Хто быў сляпым –
Стаў бачыць.
Зямлю i неба –
Ў нейкi мiг! –
Хто здолеў
Так зыначыць?..

Нi вея лютая
Зiмой,
Нi майскi гром
У цiшы,
А шэпт абуджаны:
– Ты – мой!..
I свет –
Зрабiўся iншым.

СУЧАСНАЯ КАЗКА-БЫЛЬ

Ручанькі азяблыя
Выцягнеш:
– Сагрэй!..
Шчасце
Райскім яблыкам
Стыне
Ля дзвярэй.
Свеціць
Над планетаю
Зорная трава.
Прыгажосць
Вось гэтую
Як адлюстраваць?..
Вусны
Моляць літасці
Тысячу разоў.
Перамёрзлым лісцікам –
Голас маразоў...
Ды дакладна ведаю:
Між сусветных драм,
Не,
Маю планету –
Пеклу –
Не аддам!..



Яшчэ мы недзе там,
Далёка,
На іншым беразе
З табой.
Між намі –
Холад,
Слота,
Спёка,
І снегавей,
І лістабой...
Яшчэ заносяць
Снегапады
Сцяжыну,
Стаўшую мяжой
Тваёй уласнае спагады
І – адпаведнае –
Чужой.
Яшчэ, як некалі,
Віруе
Рака
Святога пачуцця,
А ўжо ніколі
Не даруе
Нам
Ледзяного забыцця...
Яшчэ,
Адолеўшы завею,
Такія розныя ў жыцці,
Як мы змаглі,
Не разумею,
На гэты бераг
Перайсці...

ВЁСКА БЯРЭЖКІ

Знаёмыя твары сяброў,
Прыветныя ўсмешкі.
На ўзмежку
Вячыстых бароў –
Бярэжкі.

Дзе рэха
Канала ў журбе
Капежнай,
Ці не прысніўся
Табе?
– Канешне...

Варушыцца
Зноў напамін
Хваляй...
З табою,
Дзе сёння адзін,
Стаялі...



Нашто ж на зямлі
Сваркі і звадкі, боль і горыч,
Калі ўсе мы разам ляцім
Да зор?

М. Багдановіч


Жанчыне дадзена –
Радзіць,
Жанчыне дадзена –
Расціць.
Каханай быць,
Адзінай быць.
Крый бог,
Дзяцей асіраціць.

Я рос з дзяцінства
Сіратой,
Туманы піў,
Як сырадой,
І пад вандроўны стук
Калёс
Глытаў
Ільдзінкі слёз.

Спасціг
З трывогаю цяпер:
У чалавеку
Дрэмле звер,
І пры жывых бацьках –
Штогод
Расце
Атрад сірот.

Няўжо
Забыліся зусім,
Як вочы нам

Адкрыў Максім:
Навошта сваркі,
Звадкі,
Боль?..
У гэтым соль...



Калі ты раптам
Не ў гуморы –
Шукай збавенне,
Як вясло.
Тваю душу
Ачысціць мора
Надзеі,
Роздуму
І слоў...

Твой позірк
Сэрца мне параніў,
Што промень,
Кінуты уніз.
І гэта
Сонечнае ранне
Свой сэнс прымае
І абрыс...

Дыхне прыбой
Пяшчотай мая,
І думкам
Песна ў галаве...
Зямля – дае,
Зямля – прымае...
Ад году ў год,
Ад веку ў век...

МАРАФОН

1

Зноў кліча за парог
Вандроўны сверб дарог.

За кратамі акон –
Жыццёвы марафон.

Ах, аўтамагістраль!..
Нясе няспынна ўдаль

Між хваляў гаманкіх,
Што рэчышча ракі.

Ці дождж ідзе, ці снег,
Вітаем вольны бег

За дом, за небасхіл,
Адчуўшы радасць крыл...

2

Разрэзана самота
Вінтамі самалёта.

Ушчэнт тугу разбілі
Чаўны, аўтамабілі.

Калі ж пагасне сонца
Навек для марафонца,

Няхай над ім устане
Не крыж, а скрыжаванне...

СЦЮАРДЭСА


Яна,
Нібы багіня,
Між небам
І зямлёй.
Здаецца,
Што пакіне
Вось-вось цябе
Спакой.
Нашмат зырчэй
Ад зорак
Пагляд яе вачэй,
Што разразаюць морак, –
Як лазерам, –
Ушчэнт.
Вы скажаце:
Натхненне?..
Пры чым яно,
Пры чым,
Калі для захаплення
Шмат знойдзецца
Прычын.
Сусвет
Здранцвеў навокал.
І я удзячны,
Лёс,
Што да зямлі
Далёка
І блізка
Да нябёс...



Бераг сонны.
Раніца.
Дрэмле цішыня.
Толькі сосны Райніса
Вершамі звіняць.

Нас пытае Даўгава:
– Гаўя дзе – дачка?..
Каля мора самага –
Дотык землячка:

Вецярок з Палесся
Шугануў у твар,
Маладою песняй
Поўнячы абшар...



А мора –
Не ў гуморы:
З нябёсамі
Гаворыць
Бязмежная стыхія.
Ці ж берагі –
Глухія?..
Ну што табе
Дзевяты вал,
Калі ў руках –
Штурвал!..



Уладзіміру Маруку

Калі ў чаканні цуда
Прыпалі да акон,
Чыталі твой,
Піцунда,
Няпісаны закон.

Закон вады і глебы,
Закон нізін і гор...
Хаця маўчала неба,
Гучаў
Марскі прастор.

Шумеў ля ног паспешна,
Нібы хацеў сказаць
Аб тым,
Што непазбежна
Нам трэба разгадаць.



Ля Гагры
хвалі хваляцца
Дрыготкаю пяшчотаю.
Валы
на бераг валяцца
Праз ноч,
на зоры шчодрую.

Да болю
галька колецца
Шчымлівымі ўспамінамі.
Над морам
чайка моліцца
Стыхіі неабдымнае.



Рэліктавай сасны
Такі нязвыклы водар.
Расчынена Апсны
Уся:
　　ад гор да водаў.

Аблок,
　　нібы рукзак,
Завязаны на вузел.
Ці мо пяро зямляк
Згубіў –
　　палескі бусел
Дарогаю дамоў
Між гор
　　з краёў далёкіх...
Прымроіцца ізноў:
Нібы буслы –
　　аблокі...



Ці ты тутэйшы,
ці з эліты
Да гор прыехаў загараць,
А сталактыты,
сталагміты
Для ўсіх аднолькава гараць.

Нова-Афонская пячора –
Зьнямелых нетраў галасы.
Шкада сягоньня мне,
што ўчора
Не бачыў гэтае красы.

НА РЫЦЫ

1

Здаецца,
Вечнасць тут
Гняздзіцца.
Смяецца
Сонечная Рыца.

2

Адкрыццяў тут
Зрабіў нямала,
Але найбольш
Адно цаню:
Яна навекі
Паяднала
І вышыню,
І глыбіню...



Уладзіміру Бурдзялёву

Аўтобус.
Ранішні маршрут...
Мяшок каменны.
Акамянелі
Людзі тут
Ад перамены:

Над галавою
Грозных скал
Вісяць лавіны.
Зусім калматы
Іх аскал,
Амаль ільвіны.

Трымаюць сцены
Неба дах
Вякі якія?..
У белых воблакаў
Садах –
Анакапія.

Маўчыць
Загадкава маяк –
Асветнік ісцін.
З вякоў мінулых
Нам ніяк
Назад не выйсці.

НА ІСЛАЧЫ

(Трыпціх)

1

Галіна грому,
Віснучы,
Абрынецца на дол,
І гэты міг на Іслачы
Асвеціцца наўкол,
Нібыта фотаўспышкамі,
Маланкамі,
Калі
Радкі
Цяжкімі шышкамі
Зрываюцца з галін...

2

Тут гайдаюць блакіт
Вершаліны
І аблокамі таюць
Хвіліны,
Б'ецца ў сцішаны бераг
Рачулка,
Нібы сэрца тваё,
Гулка-гулка.
Тут лунаюць,
Як сны,
Светла мары,
Ахінаючы крыллем
Абшары,
А за намі крадуцца
Тры цені
У праменным
Трымценні...

3

Бяжыць
Жывіца па камлю,
Праменны дзень
Іскрыцца.
Люблю
Зялёную зямлю,
Якой –
Не надзівіцца.

Глядзяць
Сасновыя ствалы
У вокны –
Не гарматныя.
Рыпяць
Драўляныя сталы,
Дарункамі багатыя.

І свежы водар
Спакваля
Струменіць над палянаю,
Дзе пахне
Шчодрая зямля
Буханкаю духмянаю.



Хай верш,
Нібы вясною
Трава пасля дажджу,
Асвеціць навізною
Зямлю маю, душу.

Дыхне паветрам свежым,
Разгон свой беручы
Ад соснаў Белавежы
Да лепельскіх лагчын.

Уздымецца на дыбкі
За сонейкам услед.
І,
Як Сымон на скрыпцы,
Зайграе на ўвесь свет.

Як радасцю скразною
Праніжа ўсіх, –
Скажу:
Мой верш,
Нібы вясною
Трава пасля дажджу...


ПАЭТ

1

Між звадак,
Войнаў і парокаў
Паэт павінен
Быць прарокам.
Павінен быць
Празорцам трохі
Сваёй
Няўдзячлівай эпохі.
Свет немагчыма
Перайначыць, –
Дык чуйна чуць
І востра бачыць.

2

А талент?..
Талент даражэй,
Што дадзен Богам.
Паэт павінен
Быць вышэй
Сябе самога...



Душою
Усе мы –
Паэты!..
Калі
У люстэрку душы
Адбіцца
Паспеюць планеты,
Але не разбіцца, –
Пішы!..

Калі
Пры святле зоркападу
Заспееш
Душой разглядзець
І боль,
І імгненную радасць
Зусім незнаёмых
Людзей,

Нябёсы вачэй
Адлюструеш,
Расінку
І зорны сусвет...

Паэт –
Хто заўжды
Рызыкуе.
Без рызыкі ён –
Не паэт!..

УЗАЕМНАСЦЬ

Рыгору Барадуліну

Гадоў адлётных
Зоркапад.
А муза –
Юнакуе.
У тры сярпы
Жне лаўрэат
Дзялянку трапяткую:
Рэдактар, аўтар,
Перакладчык
Дарослых кніжак
І дзіцячых.
На зерне слоў
Заўжды багаты,
Шчырун,
Руплівы хлебароб,
Табе крыло
Ушацкай хаты
Вышэй было
За небаскроб.
Сакрэт актыўнасці,
Прызнацца,
Адкрыў
Не многа-мала Ты:
Да сотні год
Сябруй з юнацтвам –
І вечна будзеш
Малады...



Ты – гараджанін,
Толькі напракат
Не возьмеш памяць
Дзедаўскай катрынкай,
Дзе думка,
Выгібаючы асфальт,
Прабілася
Дрыготкаю травінкай.


МАЛЕНСТВА

Прысніўся дзіўны сон:
Чырвоны конь ля гаю
Імчыцца наўздагон,
Услед за мной
Сягае.

А я бягу,
Бягу,
Баюся азірнуцца.
На пудкім мурагу
Расінкі звонка б'юцца.


Праз тоўшчу зім і лет,
Шпарчэй нашмат,
Гайня як,
Ляціць той конь услед
І быццам
Даганяе.

Імчыцца,
І, лічы,
Вось-вось –
Мяне дагоніць.
Прачнуўся...
А ўцячы
Ці змог
Ад той пагоні?..



Лес па-сяброўску
Мне даверыў
Сівыя былі
Ўсіх часоў,
Каб перанёс я
На паперу
Агонь
Світальных верасоў,
Каб,
Паланёны прыгажосцю,
Цяпло іх
Словам перадаў...


І каб не быў я
Толькі госцем
Між гонкіх дрэў
І ніцых траў...



Так многа
Год сплыло
Ракою.
Упушчана вясло
Рукою.

І човен
Сцішыў бег
Паволі,
Каб не забыць
Табе –
Ніколі! –
І першы
Школьны баль
Да рання,
І шэпт
Дрыготкіх хваль
Кахання...

Ты кажаш,
Што пражыў
Шчасліва.
Чаму ж так
На душы
Шчымліва?..



Ізноўку восень тлумная
Запальвае кастры.
Глядзім:
Завулак Клумава
У золаце гарыць.

Апошні ліст трапечацца
Ад ветравых
Пагроз,
Агнём,
Нібыта вечнасцю,
Прасвечаны наскрозь...



Шаптала снежная бяроста.
Відаць,
Свярбела прадказаць...
А нас даўно
Чакала ростань,
Дзе бестурботна палазам.

Канала
Ўснежаная скруха.
І ты вяртаўся на мяжу,
Дзе бунтавала завіруха
Тваю астылую
Душу...



Мой лес,
Мой вечны лес...
Паверыш –
Не паверыш:
І тут
Паспеў прагрэс
Парушыць
Часу неруш,

Гармонію жыцця
Ўсяго
Ляснога дзіва.
Я чую
Шум лісця:
– Ці ж гэта –
Справядліва?..

Камлі
Ля самых рэк
Грызе
Піла тупая,
Калі
Наступны век
На пяты
Наступае...

ДЫЯЛОГ СА СТРАХАГЕНТАМ

Звініць званок...
– Кліент,
Прывет!..
Я – страхагент.
Застрахаваць
ад страху?..
– О, ты –
падобны магу!..
– Ва мне
патрэба ёсць?..
– Бадай,
глядзіш наскрозь.
Заходзь смялей,
агент,
Падпішам дакумент.
Хутчэй,
жаданы госць:
Скрыпіць
зямная вось, –
Прыспічыла страхоўка...
Чаго стаіш
нялоўка?..
Сядай за стол,
пішы –
Фіксуй,
што на душы...
Ратуй людзей,
агент,
Ад жудасных ракет
Абуджанага рэха...
– Таварыш,
з глузду з'ехаў?
Мо п'яны?..
Ці – паэт?..

– Душа баліць,
агент...
– Дык ты –
душэўнахворы?
– Дзівак,
пра што гаворыш?
Калі баліць душа –
Ратуй Зямлю спярша,
Пытацца –
будзеш потым.
Крывёю,
тлушчам,
потам –
Аплоцім мы
страхоўку.
– Я...
не вазьму да толку...
– А ты –
зусім не маг:
Усё хлусіў пра страх.
– Пусці мяне,
вар'ят!.. –
Агент даўно не рад
Мне
і маёй кватэры.
І раптам –
шмыг за дзверы...
– Пастой!... –
крычу,
малю,
Губляючы адвагу.
...Я так хацеў
Зямлю
Застрахаваць
ад страху.

МАЎЧАННЕ ЗОР

Мы паслалі сігналы да 14 бліжэйшых зорак. У выпадку спрыяльнага выніку адказы прыйдуць у 2018 — 2074 гадах...

В. Троіцкі,
член-карэспандэнт АН СССР

1

Касцёр гарэў.
Скакаў агонь, –
Ты вынайшаў яго...
Твой позірк грэў
Зярняты зор
Між воблачных снягоў.
Ты цвёрда верыў,
Чалавек:
Зярняты прарастуць
Адкрыццямі...
У новы век
Касмічную вярсту,
Нібы аблогу
У тайзе –
Глыбока разарэш.
Ты вырастаў,
Нібы з адзеж,
З адкрыццяў –
Пакрысе...

2

Спрадвек красуе
Млечны Шлях,
Калосіцца ўгары.

– Ці ёсць жыццё
На тых палях?.. –
Мяркуюць плугары.

– Ці ёсць там –
Плёсы і брады?.. –
Пытанне прабяжыць.

– Бадай,
Па розуму браты
Павінны
Ў небе жыць!..

– Хутчэй жа ім
Пашлем сігнал, –
Дадзім
Умоўны знак...

Антэна
Мацае канал:
Эфір трасе
Скразняк...

3

Нашчадак,
Выслухай мяне:
Пакуль пішу пяром,
Не раз
Планету скалане
Ўгары
Ракетны гром.

Не раз
Свінцовыя дажджы
Пабачыла Зямля.

Ці давядзецца
Нам дажыць
Да сонечнага дня?..

Ці давядзецца
Нам пачуць
Кліч зораў
Паміж хмар?..

Шапчу –
Да сонейка качу
Зямны,
Здаецца,
Шар...

4

Яна не спіць...
Суладна часу
Рытмічна круціцца Зямля.
Нібы радар,
Любую трасу
Фіксуе зблізку
І здаля...
Хутчэй –
У вечнае прасторы –
Пачуць бы
Выснены адказ!..
. . . .

Калі Зямлі
Адкажуць зоры,
То ці заспеюць,
Людзі,
Нас?..

САД

Світай, вясна надзей!
У першацвеце – зоры.
Тут кожны новы дзень
Адкрыццямі азоран.

Цвіце касмічны сад
Галініста, высока
Убірае, як раса,
Святло далёкіх вокан.

У іх жа – страх застыў
Дрыготкаю надзеяй:
Па розуму браты
Цябе ці зразумеюць?

Цвіце касмічны сад
Трывожнага Сусвету:
І над зямлёй,
І пад –
Начынены ракеты...

Хістае свет ад звад,
І сад –
Дрыжыць раздзеты:
Мо ў завязі прысад
Не яблыкі – планеты


Зрываюцца з галін,
Цяжэзныя ад зброі?..
Няўжо, сыны Зямлі,
Смяротны груз патроім?

Не веру, зоркапад,
Вар'яцкаму загаду,
Які
Планету нат
Сарве з галінак саду.




Зайздрошчу лесу:
Ён глыбока
У глебу родную
Урос.
Зайздрошчу лесу:
Ён высока
Узняўся ўгору –
Да нябёс.

Тут,
Пад сасновай вершалінай,
Цар-грыб
Скідае капялюш.
Тут пні імшэюць
І галіны,
Але няма
Замшэлых душ...




Раней за байніцамі муроў
Хаваліся ўзброеныя абаронцы,
Цяпер адтуль выглядвае
Безабаронная Гісторыя...




Рыцарскія даспехі сярэднявечча
Па плячы сучасным падлеткам,
Якія яшчэ не дараслі
Да рыцарскіх паводзін.

***


Вы чуеце,
Як варушыцца цішыня,
Замураваная ў каменных сценах
Нясвіжа альбо Сігулды?..



Уздымаючыся на вежу
Турайдскага замка,
У мяне перахоплівае дых
Ад усведамлення таго,
Што сучаснасць
Знаходзіцца куды ніжэй
Мінуўшчыны...



Старыя замкі
Помняць даўніну,
Якая ім
І нам наканавана...



Такая сёння ціша,
Якую спудзіць –
Грэх.
Хай ночка закалыша
І сон,
І стогн,
І смех...

Рамонак не хіснецца,
Не плешчацца рака,
Калі
Ляжыць на сэрцы
Тваім –
Мая рука.

Дыктуе штось
Імкліва
Двух сэрцаў ўнісон,
І ноч
Бярэ маўкліва
Пад зорны парасон.

І я
Лічу за шчасце
На сонным мурагу
Да келіха прыпасці
Тваіх
Мядовых губ...

Абудзіць
Наша змова
Жаданняў райскі сад.
Як многа мне
Без словаў
Раскажа
Твой пагляд.

ЖАРТОЎНАЕ

Экзатычны кіпарыс,
Мора ўсмешлівы абрыс.
Чайкі
Плаўкамі дзяўчат
Агаляюць далягляд.

Неба ўспененая гладзь,
Думкі
Птушкамі ляцяць,
Што ўздымаюць над вадой
Лёгкі сонечны настрой.

Нагадай мне,
Нагадай,
Як бяссонная вада
Паглынае рэшткі слоў,
Набягаючы ізноў.

Ты сягоння не праспіш
Раннем спуджаную ціш.
Сну кароткаму –
Шабаш,
Паспяшаемся на пляж.

Дрэмлюць горы над табой,
А ля ног –
Шуміць прыбой.
І ад сонца анідзе
Не схаваешся ў вадзе.

Нагадай мне,
Нагадай,
Як бяссонная вада
Паглынае рэшткі слоў,
Набягаючы ізноў...



Ты помніш
Вуліцу юнацтва
І наш студэнцкі
Інтэрнат,
Дзе дружба цэніцца,
Як брацтва,
А кожны сябар,
Нібы брат?..

Там расчыняліся
Нам далі,
Вясной абуджанай,
Зямлі,
І нават танцы
У падвале –
Вышэй астанкінскіх
Былі.

Мы там жылі
І шчыравалі,
Нектар каханых губ
Пілі...
Замест
Ранейшай магістралі
Яе
Праспектам наракли.

Нібы далонямі,
Атуліць
Мяне кварталамі
Ізноў...
Хаця мяняюць
Назвы вуліц,
Але нязменная –
Любоў.

ТУРАЙДСКІ ЗАМАК

Прымаючы парады
Дасведчаных сяброў,
Паедзем да Турайды
Абуджаных муроў.

Уздымімся на вежы
Па лесвіцы крутой,
Дзе кожны шрам
Належыць
Гісторыі святой.

А ўнізе,
Дарагая
І людзям,
І багам,
Там Гаўя прысягае
На вернасць берагам.

Пачутае паданне
Спагадай ахінём,
Якое не завяне
Пялёсткавым агнём,

Крывёй Турайдскай Ружы[1],
Пралітай ля муроў,
Што можа так узрушыць
Тваю жывую кроў...

[1] Турайдская Ружа — гераіня латышскага падання.

У ЮРМАЛЕ

Завуць тут мора
Юраю,
Нібыта сябрука.
Адчулі
Ўласнай скураю
Мы подых вецярка,

Які ўздымае ветразі,
Імклівы,
Трапяткі...
Па-змоўніцку
На беразе
Міргаюць маякі.

І дзюнамі,
І соснамі
Аздоблены наўсцяж
За гмахамі высознымі,
Адкрыты ветру,
Пляж,

Дзе хвалі
З сіняй далечы
Спяшаюць да зямлі,
А сонца,
Адплываючы,
Ныццуе
У заліў...

ЗМЕСТ

„Прачнуцца..." *3*
„Тут ява..." *4*
Барысаў камень *5*
Амазонка *(паэма)* *6*
„Гэта свята заўсёды..." *13*
Лясная балада *14*
„Такая ціш..." *18*
„Да Балтыкі..." *19*
„Мой сакавік..." *20*
„Зэльва..." *21*
Дзень волі *22*
Вяртанне крылатых сяброў *23*
Юрку Голубу *24*
„Пратрубіў пабудку..." *25*
„Шуміць за вокнамі..." *26*
Паласа перашкод *27*
„Няміга..." *28*
„Заложнікі... Заложнікі бяды..." *29*
Дэзактывацыя... *30*
„Адчуеш..." *31*
„Прыбудзе заўтра..." *32*
„Гандлююць целам..." *33*
„Плююць у студню на зары..." *35*
„Павісне свет..." *36*
„Жыццё..." *37*
„Здалося мне..." *38*
„Два дні..." *39*
Будатрадаўцы *40*
Сляды *41*
„Мой лёс..." *42*
„Хаця..." *43*
Твaё імя *44*
„Пакойчык сціштаны..." *45*
Спрадвечнае *46*
Сучасная казка-быль *47*
„Яшчэ мы недзе там..." *48*
Вёска Бярэжкі *49*

„Жанчыне дадзена...“ *50*
„Калі ты раптам...“ *52*
Марафон *53*
Сцюардэса *54*
„Бераг сонны...“ *55*
„А мора...“ *56*
„Калі ў чаканні цуда...“ *57*
„Ля Гагры...“ *58*
„Рэліктавай сасны...“ *59*
„Ці ты тутэйшы...“ *60*
На Рыцы *61*
„Аўтобус...“ *62*
На Іслачы *(трыпціх)* *63*
„Хай верш...“ *65*
Паэт *66*
„Душою...“ *67*
Узаемнасць *68*
„Ты — гараджанін...“ *69*
Маленства *70*
„Лес па-сяброўску...“ *71*
„Так многа...“ *72*
„Ізноўку восень тлумная...“ *73*
„Шаптала снежная бяроста...“ *74*
„Мой лес, мой вечны лес...“ *75*
Дыялог са страхагентам *76*
Маўчанне зор *78*
Сад *81*
„Зайздрошчу лесу...“ *82*
„Раней за байніцамі муроў...“ *83*
„Рыцарскія даспехі сярэднявечча...“ *84*
„Вы чуеце...“ *85*
„Уздымаючыся на вежу...“ *86*
„Старыя замкі...“ *87*
„Такая сёння ціша...“ *88*
Жартоўнае *89*
„Ты помніш...“ *90*
Турайдскі замак *91*
У Юрмале *92*

Мазго У.

М 13 Марафон: Вершы і паэма. – Мн.: Маст. літ. 1992. – 94 с.

ISBN 5-340-00907-6.

Мозго В. Марафон: Стихи и поэма.

У трэцяй па ліку кніжцы вершаў аўтар паказвае складаны свет нашай рэчаіснасці. Сівая мінуўшчына роднага краю гэтак жа глыбока хвалюе яго, як і супярэчлівая сучаснасць.

Паэт разумее, што без гістарычнай памяці ніякі народ не будзе мець будучыні. Наша жыццё, сцвярджае ён, гэта няспынны марафон, праз які трэба з годнасцю пранесці мару і веру, надзею і каханне.

М $\frac{4702120202 - 078}{М\ 302\ (03) - 92}$ 52–92 ББК 84Бел.7

Литературно-художественное издание

МОЗГО Владимир Минович

Марафон

Стихи и поэма

Минск, издательство „Мастацкая літаратура"

На белорусском языке

Літаратурна-мастацкае выданне

МАЗГО Уладзімір Мінавіч

Марафон

Вершы і паэма

Рэдактар *Хв. Д. Жычка.* Мастак *У. М. Жук.* Мастацкі рэдактар *А. М. Малышава.* Тэхнічны рэдактар *І. І. Дуброўская.* Карэктар *Л. П. Бялова*

ІБ № 3684

Здадзена ў набор. 12.07.91. Падп. да друку 09.03.92. Фармат 70×90 1/32. Папера друк. 1. Гарнітура Прэс Раман. Ум. друк. арк. 3.51. Ум. фарб.-адб. 3,80. Ул.-выд. арк. 3.08. Тыраж 1000 экз. Зак. 49. Цана 1 р. 50 к.

Выдавецтва „Мастацкая літаратура"
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь
220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Баранавіцкая ўзбуйненая друкарня, 225320, Баранавічы, Савецкая, 80.

1 р. 50 к.

